1Н/Н4504
(1939)

# Максім Багдановіч

100

1Н//14504
(039)

БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА "КНІГА"

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

## Матэрыялы да святкавання 100-гадовага юбілею паэта

Мінск 1991

1Н// (039)

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

ББК 78.38

Б I4

Складальнік М.Р.Розум

Рэдактар Я.М.Бяганскі

Максім Багдановіч: Матэрыялы да святкавання I00-гадовага

Б I4 юбілею паэта /Склад. М.Р.Розум. — Мн., 1991. — 62 с.

У выданні змешчаны матэрыялы да падрыхтоўкі і правядзення у арганізацыях таварыства "Кніга" Беларусі масавых мерапрыемстваў, прысвечаных жыццю і творчасці Максіма Багдановіча, аднаго з таленавіцейшых беларускіх паэтаў. Могуць быць выкарыстаны масавымі бібліятэкамі, у літаратурных тэатрах, клубах аматараў кнігі, выкладчыкамі агульнаадукацыйных школ, ПТВ, лектарамі і дакладчыкамі.

ББК 78.38

Беларускае таварыства
"Кніга"

Пралятайце вы, дні,
Залатымі агнямі.
Скончу век малады, -
Аблятайце цвятамі...

М.Багдановіч



## Ад складальніка

9 снежня 1991 года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Максіма Адамавіча Багдановіча, выдатнага беларускага паэта, таленавітага літаратуразнаўца, гісторыка, крытыка і перакладчыка. Чалавек незвычайнага таленту і незвычайнага лёсу, ён набыў вядомасць сваім літаратурным, грамадзянскім і чалавечым подзвігам. Да яго ніколі не згасаў інтарэс грамадскасці. У сябе на радзіме, у Беларусі, Максім Багдановіч быў прызнаны і любім даўно. Ужо для некалькіх пакаленняў беларускіх чытачоў ён — класік нацыянальнай літаратуры, заўсёды называемы першым пасля Я.Купалы і Я.Коласа.

Юбілей нашага славутага беларуса, несумненна, будзе адзначацца як усенароднае свята. Многае могуць і павінны зрабіць да гэтага юбілею арганізацыі таварыства "Кніга" сумесна з масавымі бібліятэкамі, грамадскімі арганізацыямі рэспублікі. Менавіта на іх і разлічаны дадзеныя матэрыялы, падрыхтаваныя на аснове твораў М.Багдановіча, а таксама літаратурна-крытычных кніг і артыкулаў, прысвечаных яго жыццю і творчасці.

У прапануемы зборнік уключаны канкрэтныя матэрыялы з разлікам на тое, каб прапагандысты кнігі змаглі правесці ў працоўных калектывах, школах і іншых навучальных установах літаратурныя гутаркі па старонках біяграфіі М.Багдановіча на тэму "Як зорка яркая над родным краем", устроіць сцэнічную кампазіцыю, або тэматычны вечар "Цвяток радзімы васілька", арганізаваць віктарыну, вусны альманах, выпусціць юбілейны літаратурны каляндар і г.д.

Хочацца спадзявацца, што выданне прынясе карысць арганізатарам юбілейных мерапрыемстваў у гонар стагоддзя Максіма Багдановіча, будзе садзейнічаць далучэнню чытачоў да нашай культурнай спадчыны.

## ЯК ЗОРКА ЯРКАЯ НАД РОДНЫМ КРАЕМ

### Па старонках біяграфіі М.Багдановіча

...Песняй абвостраны слых
Чуеш, Максім? — не умірае!
Гэта з табой. I для усіх
Зорка Венера світае.

Я.Янішчыц

У нашай краіне і ва усім свеце шырока вядомы імёны і творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа — вялікіх беларускіх пісьменнікау, якія сталі песнярамі гістарычных лёсау свайго народа, будзіцелямі яго нацыянальнай самасвядомасці.

Але быу яшчэ адзін беларускі паэт, парауналька менш вядомы шырокаму чытачу, чым Купала і Колас. Гэта — Максім Багдановіч. Ён іх сабрат, саратнік па думках і імкненнях, па накіраванасці і зместу грамадска-літаратурнай дзейнасці, па прыналежнасці да духоунай культуры беларускага народа.

Паэт Ніл Гілевіч назвау Багдановіча адной з самых выдатнейшых фігур не толькі у беларускай, але і у агульнаславянскай, а мабыць, і у сусветнай культуры.

У сталіцы Беларусі — Мінску на доме № 25 па вул.М.Горкага /былой Аляксандраускай/ установлена мемарыяльная дошка з барэльефам паэта. На ёй словы:

> "На гэтым месцы знаходзіуся дом, у якім 9 снежня /27 лістапада/ 1891 года нарадзіуся выдатны беларускі паэт Максім Багдановіч".

Дом быу двухпавярховы, драуляны. На першым паверсе размяшчалася гарадское пачатковае вучылішча, на другім — настаунікая ква-

тэра. У ёй, у згодзе і каханні кватаравалі маладыя Багдановічы. Тут у іх і нарадзіўся другі хлопчык, якога назвалі Максімам.

Бацька паэта, Адам Ягоравіч Багдановіч /1862—1940/ быў сынам простага селяніна, чалавек вельмі своеасаблівы, цікавы. Скончыўшы гарадскую пачатковую школу і паспеўшы перабраць мноства розных прафесій — ад кандытара да рабочага ў чыгуначным дэпо, — семнаццацігадовы юнак паступае ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якая мела крамольную па тым часе рэпутацыю "мужыцкага універсітэта". Пасля яе заканчэння малады народны настаўнік асталяваўся ў Мінску, дзе наладзіў цесную сувязь з мясцовай арганізацыяй "Народнай волі" і неўзабаве зрабіўся адным з яе кіраўнікоў. Арганізацыя займалася пераважна асветніцкай работай сярод раменнікаў, рэвалюцыйнай сацыялістычнай прапагандай сярод рабочых. Спраў у А.Я.Багдановіча было многа. Ён даваў прыватныя урокі, збіраў і апрацоўваў этнаграфічныя матэрыялы, вёў агітацыю сярод настаўнікаў, удзельнічаў у літаратурных вечарах.

Маці Максіма — Марыя Апанасаўна родам з Ігумена /Чэрвеня/, з беднай сям"і. Скончыла Вышэйшыя настаўніцкія жаночыя курсы ў Пецярбургу. Некаторы час займалася педагагічнай працай, мела спецыяльную музычную падрыхтоўку, добры голас, "многа чытала" /па успамінах А.Я.Багдановіча/. Была схільна да мастацкай творчасці, друкавалася ў газеце "Гродненские губернские ведомости".

Маленства будучага паэта прайшло ў Гродна, куды бацька пераехаў у сувязі з пераходам на службу ў Сялянскі банк. Не споўнілася Максіму і пяці год, як ад сухотаў у маладым узросце памірае яго маці, пакінуўшы трох асірацелых дзяцей. У 1896 г. сям"я Багдановічаў пераязджае ў Ніжні Ноўгарад, жыццё ў якім пакінула глыбокі след у душы Максіма. У 1902 г. ён паступае ў Ніжагародскую мужчынскую гімназію, удзельнічае ў студэнцкім рэвалюцыйным руху. У гэты час

і пачынаюць праяўляцца паэтычныя здольнасці М.Багдановіча.

У Ніжнім Ноўгарадзе Адам Ягоравіч блізка знаёміцца, а потым і радніцца з узыходзячай вядомасцю — Максімам Горкім /яго другой жонкай стала Аляксандра Паўлаўна Волжына — сястра К.П.Пешкавай, жонкі М.Горкага/.

З дзіцячых год Максімам авалодала моцная цяга да чытання. Недарма потым ён выбірае сабе літаратурны псеўданім "Максім Кніжнік". Чытаннем кіраваў бацька: першымі кнігамі былі зборнікі беларускіх і рускіх народных казак, складзеныя Шэйнам, Раманавым, Афанасьевым, герaічны эпас розных народаў, творы Пушкіна, Гогаля, Міцкевіча, Сервантэса, Дантэ...

Інтарэс да сваёй радзімы, да гісторыі беларускага народа, яго культуры, мовы, побыту, паэзіі у Максіма Багдановіча прачнуўся рана. Мове сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў ён навучыўся з кніг. Творы В.Дуніна-Марцінкевіча, У.Сыракомлі, Ф.Багушэвіча, а таксама сучасных Багдановічу пісьменнікаў — Я.Купалы, Я.Коласа, К.Каганца, Цёткі выклікалі ў яго душы невыказную любасць і пашану. А між тым ён знаходзіўся ўдалечыні ад радзімы. Калі Адам Ягоравіч пазнаёміўся з рукапісамі сына, ён засведчыў: "Колькі там выпісак са слоўнікаў, зборнікаў і старадрукаваных кніг! Які з паэтаў здолеў бы гэтую цяжкую працу? А ён... падняў. І нёс яе цярпліва і настойліва".

Пачатак літаратурнай дзейнасці М.Багдановіча адносіцца да 1907г., калі ў віленскай газеце "Наша ніва" /за 6 ліпеня/ было надрукавана яго першае апавяданне "Музыка", дзе раскрываецца тэма неўміручасці мастацтва. Створаны ў апавяданні вобраз музыкі-скрыпача, прысвяціўшага сябе служэнню высокім грамадскім ідэалам — традыцыйны для беларускай літаратуры /дастаткова успомніць Ф.Багушэвіча, Цётку, Я.Купалу, Я.Коласа.../. У ім знайшла адлюстраванне вера М.Багдановіча ў будучае роднай зямлі. "З таго народу, — празорліва пі-

саў ён, заключаючы апавяданне, — катораму музыка калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем св ім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе і свабодзе..."

Праз некаторы час пасля "Музыкі", у 1909 годзе у той жа "Нашай ніве" убачылі свет два вершы паэта — "Над возерам" і "Вадзянік", якія пазней, сумесна з іншымі вершамі /"Чуеш гул?..", "Змяіны цар", "Возера", "Зімой", "Перад паводкай"/, складуць цыкл "У зачараваным царстве". Пастроены ён на матывах і вобразах язычніцкай міфалогіі старажытных беларусаў. Чытаеш гэтыя вершы і перад табой як бы паўстае беларуская зямля са сваім хараством і таямніцамі, старымі барамі, цёмнымі пушчамі...

Чуеш гул? — Гэта сумны, маркотны лясун
Пачынае няголасна граць:
Пад рукамі яго, навяваючы сум,
Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн,
Танкаствольныя сосны звіняць...
/"Чуеш гул?.."/.

Стаяў калісь тут бор стары,
І жыў лясун у тым бары.
Зрубалі бор — лясун загінуў,
Во след яго ад той пары:
Сваё люстэрка ён пакінуў.

Як у вязнаны свет акно,
Ляжыць, халоднае, яно,
Жыццё сабою адбівае
І ўсё, што згінула даўно,
У цёмнай глыбіні хавае.
/"Возера"/.

Прыведзеныя вершы навеяны аутару часткова кнігай бацькі /"Пережитки древнего миросозерцания у белорусов", якая выйшла у 1895 г. у Гродне/, а часткова ідэйна-стылявымі пошукамі рускіх паэтау і мастакоу таго часу. Але галоунае у вершаваным цыкле М.Багдановіча было імкненне усвядоміць — праз міфалогію, фальклор /гэту памяць народа, "прапамяць нацыі"/ — спецыфіку духоунай самабытнасці свайго народа.

Паралельна з міфалагічнымі вершамі /у 1908—1909 г.г./ ствараліся і творы іншага плана. Да іх ліку адносяцца такія сацыяльна завостраныя рэчы, як "З песняу беларускага мужыка", "Край мой родны! Як выклятн богам...", у якіх таксама, хаця і з другога боку, малявалася аблічча роднай зямлі. Паэт загаварыу вуснамі беларускага селяніна-бедняка:

Гнусь, працую, пакуль не парвецца
Мне жыццё, як сагніушая ніць;
А каб ведау, што столькі пральецца
Майго поту, не стау бы і жыць.

Адгаптау сотні вёрст пехатом я,
Будавау я дарогі, масты;
Ліуся пот мой, як рэзау на ком"я
Плугам глебы сухія пласты.

/"З песняу беларускага мужыка"/.

Вершы гэтыя нясуць найбольшы сацыяльны "зарад" у творчасці ранняга Багдановіча. Яны пераклікаюцца з лепшымі узорамі тагачаснай грамадзянскай лірыкі, асабліва з праграмнымі вершамі Я.Купалы і Я.Коласа.

Паэтычны характар Багдановіча на рэдкасць цэласны і мэтанакіраваны. Яго усеабдымнай страсцю была любоу да роднай Беларусі і

не многапакутнаму народу, мове. З волжскай сваёй далечы Багдановіч разгледзеў спакутаванае аблічча роднага краю, пачуў яго жальбу і праклёны. Боль за бяспраўны і ўніжаны стан народа быў пачаткам многіх творчых імкненняў душы паэта.

Народ, Беларускі Народ!
Ты — цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.

/"Народ, Беларускі Народ!"/.

Быццам узяўшы на сябе віну ўсіх вінаватых дзяцей Айчыны, Багдановіч гатоў гэтую непамерную цяжкасць, гэтую наследніцкую віну несці да канца.

Маці родная, Маці-Краіна.
Не ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

/"Пагоня"/

Беларусь прыняла свайго сына. У I9II годзе Багдановіч з волжскіх краёў выршыў упершыню накіравацца на радзіму, у край васільковых палёў, дзе асаблівa блакітнае неба і асаблівa буйныя зоркі... Хаця здароўе паэта ў той час ужо давала аб сабе знаць. Максім стаміўся і адчуваў патрэбу ў адпачынку. Бацька раіў яму паехаць у Крым, але сына цягнула ў Беларусь, на радзіму. Пры гэтым ён атрымаў ліст, у якім супрацоўнікі "Нашай нівы" абяцалі даць хлопцу прытулак у вёсцы, у сухой мясцовасці з густым хвойным лесам.

Дваццацігадовы выпускнік Яраслаўскай гімназіі Максім Багдановіч

прыехау у Вільню — горад, які уяуляу сабой буйны грамадскі і культурны цэнтр Літвы і Беларусі. Правёушы тут некалькі дзён, ён потым амаль два месяцы жыу у фальварку Ракуцёушчына, што недалёка ад Маладзечна. Дні вясковага жыцця абагацілі паэта шматлікімі назіраннямі, цікавымі сустрэчамі з простымі працоунымі людзьмі. Менавіта там нарадзіліся цудоуныя творы з цыклау вершау "Старая Беларусь" і "Места". А паэмы "У вёсцы" і "Веранiка", увайшлі у цыкл "Мадонны" Усё гэта потым было уключана у адзіны невялічкі памерам прыжыццёвы зборнік "Вянок", які выйшау у 1913 годзе у Вільні.

Вершы М.Багдановіча, уключаныя у "Вянок", сталі яшчэ больш вядомымі шырокім масам пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яны уключаліся у падручнікі-чытанкі і хрэстаматыі, выходзілі асобнымі выданнямі.

Хто з нас, калі быу школьнікам, не разгортвау на парце кніжку роднай мовы, не завучвау напамяць верш М.Багдановіча "Слуцкія ткачыхі" — адзін з найбольш вядомых творау паэта, яго несумненны шэдэур.

Ад родных ніу, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доугія часіны,
Дзявочыя забыушы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
..............................
Цьмянее край зубчаты бора...
І тчэ, забыушая рука
Замест персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

Колькі у гэтым глыбока вобразным і эмацыянальна багатым творы думак, пачуццяу любові да роднай зямлі, да свайго народа. Які ясны, празрысты верш — нічога лішняга, нічога, што перабівала б яго думкі і настрой! І невыпадкова праз многа год, ужо у час Вялікай Айчыннай вайны, выдатны наш беларускі паэт-партызан Анатоль Астрэйка зборніку сваіх вершау, які быу выдадзены у глыбокім падполлі на радзіме багдановічскіх ткачых, надау назву — "Слуцкі пояс".

Міналі дні... Пасля наведання Беларусі Максім Багдановіч плённа займаецца беларусазнаустствам, вывучае рускую і замежную літаратуру. За гэты час ён заканчвае Яраслаускі Дзямідаускі юрыдычны ліцэй, паранейшаму усім сэрцам аддадзены паэзіі.

У I9I4 годзе пачалася першая сусветная вайна, Мінск стау прыфрантавым горадам. Праз дваццаць гадоу, у кастрычніку I9I6 г., сюды у горад свайго нараджэння, вярнууся Максім. Паэт пасяліуся на кватэры пісьменніка Змітрака Бядулі. Адразу пачау працаваць у Мінскім губернскім харчовым камітэце, створаным творчай інтэлігенцыяй, які ставіу мэтай дапамагаць тым, хто пацярпеу у гады імперыялістычнай вайны. Камітэтам быу адкрыты клуб пад назвай "Беларуская хатка", дзе наладжваліся вечары беларускай народнай музыкі, паэзіі і песні, працавала сталоука.

Пражываючы у Мінску Багдановіч многа і плённа працуе. Пасля службы звычайна наведвае Пушкінскую публічную бібліятэку /зараз Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна/, да 3-4 гадзін раніцы працуе яшчэ дома. Ён часта выступае перад моладдзю, задумвае хрэстаматыю для пачатковай школы, многа піша.

Але пагібельная хвароба, якая увагнала у магілу яго маці і старэйшага брата, была бязлітаснай і да яго...

Дауно ужо цэлам я хварэю,
I хвор душой, —
I толькі на цябе надзею,

Край родны мой!
У родным краю ёсць крыніца
Жывой вады.
Там толькі я змагу пазбыцца
Сваёй нуды.
Калі у ім умру-загіну, —
Не жалюсь я!
Не будзеш цяжкая ты сыну
Свайму, зямля.
Там хоць у гліне, хоць у брудзе,
Там, пад зямлёй,
Найдуць мае слабыя грудзі
Сабе пакой.

/"Даўно ужо целам я хвараю..."/

Усяго пяць месяцаў працягваўся мінскі перыяд жыцця Багдановіча. Паэт шмат часу аддаваў складанню беларускага буквара, літаратурнай хрэстаматыі, для якой напісаў нават некалькі нарысаў. У гэты ж час ён піша адзін з самых драматычных твораў — верш "Пагоня". З-пад пяра паэта выходзіць паэма "Страцім-лебедзь", якая стала, як адзначаюць крытыкі, яго лебядзінай песняй. Паэму аўтар чытаў у "Беларускай хатцы". Максімаў Страцім-лебедзь закрануў прысутных слухачоў. Вобраз героя, які аддаў жыццё за шчасце іншых, трагічная пагібель яго — усё гэта ўспрымалася і як рамантыка, і як жывая рэчаіснасць...

У "Беларускай хатцы", разам са сваімі мінскімі сябрамі, М.Багдановіч сустрэў 1917 год. Усе у новым годзе чакалі вялікіх змен. Было многа планаў і надзей аб адкрыцці беларускіх школ, выхадзе падручніка, выданні беларускага часопіса.

Здароўе Максіма, між тым, пагоршылася. У лютым 1917 года сябры

пасылаюць яго лячыцца у Ялту /меркавалася тэрмінам на два месяцы/. Ён і там напружана працуе. Піша вершы "Набягае яно...", "Пралятайце вы, дні...", "У краіне светлай, дзе я уміраю...", плануе выданне новых зборнікау, працягвае складаць беларускі буквар... Аднак намерам паэта не суджана было споуніцца.

Сын Беларусі памёр у Ялце ад туберкулёзу на досвітку 25 мая 1917 г., на 26-м годзе жыцця. Рукі чужых люд ей пахавалі яго тут жа, на Ауткінскіх могілках, непадалёк ад дачы Чэхава, і напісалі на магільным крыжы: "Студент Богданович Максим Адамович".

На самай прыгожай ноце абарвалася песня паэта, які адышоў ад нас так рана, але так неабдымна многа зрабіу для "Беларусі-заранačкі" /як назвау ён сваю радзіму у адным з перадсмяротных накідау/. Беларусі засталася спадчына — жыццесцвярджальная паэзія М.Багдановіча:

Заглянуушы у сваю душу:
Што там Ваша і што маё?
Вось чаму я пачуваю сябе вінаватым,
Калі я стаулю пад рознымі творамі
Толькі свой подпіс — М.Багдановіч.
Але няхай жа ведаюць людзі,
Чытаючы іх,
Што гэта ім зоркі-двайняткі
Свяцілі адной зарой.

/"Двайняткі"/.

Слова "зорка" стала сімвалам паэзіі М.Багдановіча. Ён пакінуу нас вельмі маладым, але яго талент як зорка яркая свеціць людзям, дорыць нам "светлыя згадкі", будзіць у нашых сэрцах пачуццё прыгажосці, любоу да роднай Беларусі, да чалавека.

## ЦВЯТОК РАДЗІМЫ ВАСІЛЬКА

Сцэнічная кампазіцыя

Мэта. Пазнаёміць шырокія колы насельніцтва з паэтычнай спадчынай класіка беларускай літаратуры, чалавека самабытнага таленту і незвычайнага лёсу — Максіма Багдановіча.

Афармленне. На сцэне партрэт М.Багдановіча. Справа лічба "100". Па баках палотнішчы з малюнічным пераплячэннем пялёсткаў кветак, траў роднай зямлі. Кветкі ў вазах на століках для вядучых. У зале выстаўка літаратуры "Застаўся нашым сучаснікам", плакаты, на якіх змешчаны факты з жыцця і творчасці М.Багдановіча, тэксты выказванняў аб ім і іншыя наглядныя матэрыялы, падрыхтаваныя да юбілею паэта.

У грамзапісу гучаць беларускія мелодыі, у тым ліку музычныя творы на словы Максіма Багдановіча.

Двое вядучых вызначанымі тэкстамі аб"ядноўваюць усю кампазіцыю. Ім дапамагаюць дэкламатары.

Вядучыя і дэкламатары займаюць месцы. Як толькі музыка сціхае, праз радыёузмацняльнік гучаць наступныя вершаваныя радкі:

Калі смутак моцна дзьме душу маю
І шкада мне дзён загубленых сваіх, —
Я паціху песні сумныя пяю,
Усю жуду сваю выкладываю ў іх.
Ціха песня разліваецца, звініць,
Вымаўляе, як я маладасць згубіў,
Як дагэтуль не патрапіў палюбіць,
І саусім, бадай, праўдзіва шчэ не жыў.

I вядучы. Гэты верш "Мае песні", датычыцца Беларусі і напісаны ён 17-гадовым юнаком, нашым цудоўным суайчыннікам Максімам Багдановічам у 1908 годзе, удалечыні ад сваёй радзімы.

2 вядучы. 9 снежня 1891 года у старажытным Мінску нарадзіуся чалавек незвычайнага таленту і незвычайнага лёсу. Таленту яму было дадзена ад прыроды столькі, што ён мог бы высякаць ім чароуны агонь паэзіі доугія дзесяцігоддзі.

I вядучы. Аднак лёс яму выпау больш чым жорсткі: паэт згарэу ад сухотау на дваццаць шостым годзе жыцця, усяго некалькі месяцау не дажнушы да Кастрычніцкай рэвалюцыі.

2 вядучы. Ёсць у гісторыі амаль кожнай нацыянальнай паэзіі многія вялікія імёны, жыццё якіх як легенда, а імёны як сімвалы таленавітасці, шчырасці, самаахвярнасці.

I вядучы. У рускага народа — гэта Міхаіл Лермантау і Сяргей Ясенін, у літоуцау — Юлюс Яноніс, у балгар — Хрыста Боцеу, у венграу — Шандор Петэфі. У нас, беларусау — Максім Багдановіч.

2 вядучы. Паэт-дэмакрат, паэт-патрыёт Максім Багдановіч застауся у беларускай паэзіі зоркаю першай велічыні. Яго класічную спадчыну мы сёння уздымаем упораунi з векапомнай творчасцю заснавальнікау новай беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

I вядучы. Сучаснікі Багдановіча цанілі яго найперш за шчырую любоу да простага чалавека-працауніка, беларускага селяніна, занявоненага і прыбітага, знясіленага і цёмнага. Суровым словам прауды услед за Янкам Купалам і Якубам Коласам паэт будзіу народ і клікау да новага жыцця, да барацьбы.

2 вядучы. Яго вершы "З песняу беларускага мужыка", "Краю мой родны! Як выкляты богам...", "Эміграцкая песня", "Мяжы", "Рушымся, браццы, хутчэй" пераканауча сведчаць, што беларуская паэзія можа абвінавачваць, пратэставаць, клікаць да барацьбы супраць прыгня-

тання, абуджаць веру у будучыню.

I дэкламатар.

Краю мой родны! Як выклятты богам —
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, бало..ы... Над збожжам убогім
Вецер гуляе на волі.

2 дэкламатар.

Поруч раскідаліся родныя вёскі,
Жалем сціскаюцца грудзі! —
Бедныя хаткі, тапалі, бярозкі,
Ўсюды панурыя людзі...

3 дэкламатар.

Шмат што зрабілі іх чорныя рукі,
Вынеслі моцныя спіны;
Шмат іх прымусілі выцерпець мукі
Пушчы, разлогі, нізіны.

.........................................

I дэкламатар.

У гутарках-казках аб шчасці, аб згодзе
Сэрца навін не пачуе.
Сціснула гора дыханне у народзе,
Гора усюды пануе.

2 дэкламатар.

Хваляй шырокай разлілась, як мора,
Родны наш край затапіла...
Брацця! Ці зможам грамадскае гора?
Брацця! Ці хваце нам сіл ?!

/"Краю мой родны! Як выклятты богам..."/

I вядучы. Вось гэтак трывожна і гнеўна ускліквае паэт, якому балюча бачыць столькі няпраўды і крыўды, "столькі нуды без патолі". І замест ціхай песні пра свае "загубленыя дні" у яго сэрцы выспявае песня гневу, якая "грозна разліваецца, грыміць, долю горкую мужыцкую кляне".

2 вядучы. З песняй-праклёнам прыходзіць гоўная рашучасці і веры у перамогу песня-заклік.

3 дэкламатар.

Рушымся, брацця, хутчэй
У бой з жыццём, пакідаючы жах,
Крыкі пужлівых людзей
Не стрымаюць хай бітвы размах...

Проці цячэння вады
Зможа толькі жывое паплыць,
Хвалі ж ракі заўсягды
Тое цягнуць, што скончыла жыць.

/"Рушымся, брацця хутчэй"/

I вядучы. Максім Багдановіч — мастак слова шырокага паэтычнага дыяпазону. Яго паэзія вызначаецца тэматычнай разнастайнасцю, філасафічнасцю зместу, глыбокім пранікненнем у духоўны свет чалавека, высокімі эстэтычнымі вартасцямі.

2 вядучы. Але, мусіць, толькі з вышыні нашага часу становіцца магчымым ролю і значэнне паэзіі Багдановіча адкрываць ва усёй яе велічы. Як жывое слова аб сваім часе, як праўдзівы летапіс жыцця, барацьбы, дум і пачуццяў народных пачатку XX стагоддзя успрымаем мы сёння яго паэзію.

I вядучы. На самым пачатку сваёй творчай дарогі паэт уяўляў Беларусь толькі па казках і легендах, паданнях ды павер"ях народ-

ных, што месціліся у бацькавай бібліятэцы і так моцна уразілі яго непаўторна самабытнымі вобразамі старажытнай паэзіі.

2 вядучы. У беларускай газеце "Наша ніва" у 1909 годзе убачылі свет два вершы паэта — "Над возерам" і "Вадзянік".

I дэкламатар.

Сонца ціха скацілася з горкі;
Месяц белы заплаканы свеціць,
Аглядае бахматыя зоркі,
Цягне з возера срэбныя сеці.

У іх русалкі заблуталі косы, —
Рвуць бліскучыя, яркія ніці;
Ноч плыве над зямлёй, сее росы,
Ноч шапоча русалкам: "Засніце".

/"Над возерам"/

2 дэкламатар.

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся-сплю на дне ракі.
Твар травой аблутана, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі.

Над вадой ля берага ціха спіць асока,
Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць,
Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, —
І усё навокала сном адвечным спіць.

/"Вадзянік"/

I вядучы. Гэтыя, як і іншыя вершы, напісаныя пазней, напрыклад, "Чуеш гул?..", "Змяіны цар", "Старасць" населеныя міфічнымі істо-

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

тамі, прасякнуты духам язычаскіх павер"яў, складаюць вельмі своеасаблівую старонку ў беларускай пейзажнай лірыцы, старонку, якую ў сілу абставін мог напісаць толькі Багдановіч і якую нельга паўтарыць.

2 вядучы. Побач з узорамі пейзажнай лірыкі, звязанымі з народнай міфалогіяй, у творчасці Багдановіча ёсць нямала пранікнёных радкоў аб веліччы і харастве прыроды, напісаных у строга рэалістычнай манеры. Вершы яго аб прыродзе здзіўляюць сваёй маляўнічасцю, тонкасцю і дакладнасцю ў перадачы абрысаў і ліній, фарбаў і гукаў.

Прыгадайце хаця б яго вершы "Возера", "Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог..."

3 дэкламатар.

У чарцы цёмнай і глыбокай
Плешча, пеніцца віно;
Хмелем светлым і халодным
Калыхаецца яно.

І хістаецца асока,
І шуміць высокі бор,
А ў душы не замаўкае
Струн вясёлых перабор.

/"Возера"/

1 дэкламатар.

Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
У небе месяца праглянуў бледны рог,
У небе ціха зоркі расцвілі.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

Зnічка коціцца агністаю слязой,
Прашумела мякка скрыдламі сава;
Бачу я, з прыродай зліушыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую у цішы, як расце трава.

/"Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог..."/

I вядучы. Максім Багдановіч, як зазначае пісьменнік Ніл Гілевіч, лічыўся б выдатным паэтам і тады, калі б ён нам пакінуў толькі вершы аб роднай прыродзе. На шчасце, яго паэтычны талент раскрыўся вельмі шырока. І калі гаварыць пра самае галоўнае, што перш за ўсё вызначае творчае аблічча Багдановіча і у рэшце рэшт вылучае яго у лік найвялікшых паэтаў Беларусі, то гэтае галоўнае — яго рэвалюцыйна-дэмакратычная, грамадска-палітычная лірыка.

2 дэкламатар.

Кінь вечны плач свой аб старонцы!
Няўжо жа цёмнай ноччу ты
Не бачыш, што глядзіцца сонца
У люстэрка — месяц залаты?

3 дэкламатар.

Не згасла сонца! Сонца гляне,
Усіх падыме ада сна.
Ён, гэты дзень, яшчэ настане, —
І ачуняе старана!

I дэкламатар.

Я пад яе зімовай маскай —
Пад снегам — бачу твар вясны,
І вее верш мой дзіўнай казкай,
І ясны ён, як зорак сны.

/"Кінь вечны плач свой аб старонцы..."/

<u>2 вядучы.</u> Жыццёвыя абставіны яшчэ у раннім дзяцінстве разлучылі Багдановіча з родным краем. Знаходзячыся з малых год у глыбіні Расіі, на Волзе, ён навучауся беларускай мове самастойна, галоуным чынам па беларускіх кнігах і слоуніках. І таму у яго вершах нярэдка сустракаюцца русізмы, многія словы паэт ужывае у формах, не уласцівых беларускай мове, іншы раз не на тым складзе ставіць націск. Але увогуле мова яго твораў па сваім духу ёсць мова беларускага народа. Яе характарызуе яркі нацыянальны каларыт.

Пасля заканчэння у 1911 годзе Яраслаускай гімназіі Максім Багдановіч наведау Беларусь, каб бліжэй пазнаёміцца з яе жыццём і культурай, устанавіць сувязі з беларускімі пісьменнікамі. Ён пабывау у Вільні, каля 2-х месяцау пажыу на хутары Ракуцёушчына /цяперашні Маладзечанскі раён/.

<u>1 вядучы.</u> Наведанне Беларусі стала з"явай у творчым жыцці паэта. Яно не магло не паупłываць на стварэнне цыкла "Старая Беларусь", які з"явіуся адным з вышэйшых дасягненняу паэта. У яго увайшлі такія вершы, як "Летапіс", "Перапісчык", "Безнадзейнасць" і іншыя, якія данеслі да беларускага чытача жывое адчуванне нацыянальнай гісторыі у асобах, дэталях, падрабязнасцях. Аутар дае адчуць характар старой беларускай культуры перыяду Вялікага Княства Літоускага праз вобразы летапісца, музыканта, вучонага.

Пасля наведвання музея беларускіх старажытнасцей у Вільні з"явіуся верш "Кніга".

<u>3 дэкламатар.</u>

Псалтыр, пакрытую няжорсткай, бурай кожай,
Я узяу і срэбныя засцёжкі адамкнуу,
Перачытау радкі кірыліцы прыгожай
І воску з ладанам прыемны пах пачуу.

I дэкламатар.

Вось псальма слічная. "Як той алень шукае
Крыніцы чыстай, так шукаю бога я".
Як вее свежасцю яе краса жывая!
Як радасна далей спяшыць душа мая!

2 дэкламатар.

І бачу я у канцы няхітрую прыпіску,
Што "кнігу гэтую раб божы, дзяк Гапон,
Дзеля душы спісау у месцы Ваукавыску
У рок сёмы тысяч сто васьмы з пачатку дзён".

/"Кніга"/

3 дэкламатар.

Скарына, доктар лекарскіх навук,
У доугай вопратцы на вежы сочыць зоры.
Яны спрыяюць! Час! З рухавых рук
Скарына п"е адвар пан земскі пісар хворы
І ураз пабачыу ён, што ізумруд
У пярсцёнку залатым на пальцы штосьць імгліцца,
Што блеску у ім няма... І з болем тут
Ён зразумеу, што ужо к жыццю не вараціцца.

/"Безнадзейнасць"/

2 вядучы. Арыгінальны шэдэур у названым цыкле — "Слуцкія ткачыхі". Верш раскрывае адну з старонак феадальнага мінулага Беларусі. Ва усёй Еурспе былі вядомыя золататканыя слуцкія паясы, ствараемыя у ХУШ стагоддзі беларускімі прыгоннымі сялянамі на радзівілаускай фабрыцы у Слуцку.

I вядучы. На гэтай фабрыцы працавала больш ста чалавек, у асноуным мужчыны, але былі і дзяучыны, прыгонныя Радзівілау. Выраб паясоу быу настолькі складаным, што яны і тады каштавалі многа грошай,

іх маглі купіць толькі багатыя людзі. Усяго паясоў выраблялася каля двухсот штук у год. Ткаўся пояс з шаўковых, срэбраных і залатых нітак, даўжыня вырабаў — ад двух да чатырох метраў, а шырыня — 20-40 сантыметраў. Пасля ткацкага станка пояс клалі пад спецыяльны каток, пад якім ён рабіўся, як бы літы з адзінага сплаву. На канцы пояса вышывалася, што ён зроблены ў Слуцку.

2 вядучы. Паэт бярэ гэту "вытворчую" сітуацыю і падымае яе на ўровень сваёй душы і сэрца. Невыносна цяжкая паднявольная праца ткачых. Цяжкая не толькі ў фізічным сэнсе, але і ў духоўным, маральным: "Свае шырокія тканіны на лад персідскі ткуць яны". Верш строіцца на супрацьпастаўленні.

I дэкламатар.

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.

2 дэкламатар.

А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрамззяюць хвалі

Між гор лінючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
Ї тчэ, забыўшыся, рука,
Замест персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

I вядучы. Максім Багдановіч ва ўсім абапіраецца на свой народ. "Узор васілька" становіцца ў яго сімвалам эстэтычнай самабытнасці мастацкай свядомасці народа, незалежнасці яго эстэтычных поглядаў ад іншаземных густаў паноў і уладароў.

2 вядучы. Паэт многа і напружана раздумвае над лёсамі свайго народа і радзімы: "як нявехня ў народнай сям"і, ты пасагу сабе не надбала...", — гаворыць ён аб Беларусі ў накідзе аднайменнага верша. Патрыятычная тэма знайшла асабліва дасканалае выражэнне ў вядомым санеце "Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...", прысвечаным вядомаму літаратару Аляксандру Пагодзіну, аўтару артыкула аб беларускай паэзіі таго часу.

3 дэкламатар.

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ужо колькі тысяч год стаіць магіла:
У гаршку насення жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё-ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

I дэкламатар.

Вось сімвал твой, забыт. краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я веру, бясплодна не засне,

А уперад рынецца, мауляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на простар прабіцца.

I вядучы. Старая Вільня, якую Багдановіч наведаў у 1911 годзе, дала яму "Пагоню" — адзін з самых тэмпераментных і драматычных твораў. У аўтографе верша ёсць тлумачэнне аўтара:

"У старой Вільні на муру Го трай Брамы высечаны герб мясцовы — ваякі на імкнучых конях. Гэты герб Вільня атрымала яшчэ за часы Вялікага княства Літоўскага і завецца ён "Літоўскай пагоняй".

"Пагоня" — не надпіс да герба, а зусім новае пераасэнсаванне яго сюжэта адпаведна унутраным мэтам Багдановіча як паэта нацыянальна-патрыятычнага...

Верш поўны жыцця, выяўленага надзвычай інтэнсіўна і ярка, гэтым ён перш за усё і бярэ "за жывое".

Паслухайце чаканную завершанасць кампазіцыі і гучання верша поўнасцю.

I дэкламатар.

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Успомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

У белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца; мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

2 дэкламатар.

У бязмерную даль вы ляціце,

А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?
Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі у палон?

3 дэкламатар.

Біце у сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

І дэкламатар.

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму умерці дазволь!..

2 дэкламатар.

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

2 вядучы. Прабыванне у Беларусі адкрыла Багдановічу вочы не толькі на мінулае гэтай "краіны", але і на яе сучаснае. У І9І4 годзе ён стварае такія вершы, як "Эміграцкая песня", "Мяжы", раскрываючыя супярэчнасць буржуазнага грамадства, уступіўшага у эпоху імперыялізма і пралетарскіх рэвалюцый. Галеча, беззямелле гнала людзей у пошуках кавалка хлеба за акіян, у Амерыку.

I вядучы. У пачатку 1914 года газета "Наша ніва" пісала пра лёс беларускіх эмігрантаў:

> "Беларусы, на ганьбу XX стагоддзя... замянілі сабой чорнаскурых нявольнікаў... Як тых прадавалі калісьці, сілай перавозячы у Амерыку, так цяпер паступаюць з беларусамі".

Вось, як у "Эміграцкай песні" паэт расказвае аб тых, хто вырашыў расстацца з родным краем:

I дэкламатар.

Ёсць на свеце такія бадзягі,
Што не вераць ні ў бога, ні ў чорта.
Ім прыемны стракатыя сцягі
Караблёў акіянскага порта.

2 дэкламатар.

І няма ім каго тут пакінуць,
Бо нікога на свеце не маюць.
Ўсё ім роўна: ці жыць, ці загінуць, —
Аднаго яны моцна жадаюць:

3 дэкламатар.

Пабываць у краях незнаёмых,
Ды зазнаць там і шчасце і гора,
І загінуць у хвалях салёных
Белапеннага сіняга мора.

I дэкламатар.

Але мы — не таго мы шукаем,
Не таго на чужыне нам трэба.
Не расталіся б мы з нашым краем,
Каб было дзеля нас у ім хлеба.

2 дэкламатар.

І на вуліцы пад грукат, пад гоман,
Дзе натоўп закруціўся рухавы,
Нам маячыцца вёсачка, Нёман
І агні паргавыя Лібавы.

2 вядучы. Пажар першай сусветнай вайны захапіў і частку тэрыторыі шматпакутнай Беларусі. Паэт імкнецца на радзіму. У кастрычніку 1916 года, скончыўшы Яраслаўскі юрыдычны ліцэй, ён пераязджае у Мінск, дзе працуе у Губернскім харчовым камітэце, а таксама у Беларускім таварыстве дапамогі ахвярам вайны.

Паэт ненавідзіць вайну, ён перакананы і палымяны інтэрнацыяналіст, вялікі прыхільнік дружбы і узаемаразумення людзей. У гэтым сэнсе нагадаем хаця б верш "Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...". На першы погляд ён інтымнага, а на самой справе — глыбокага філасофскага зместу. І гучыць так, быццам напісаны сёння...

3 дэкламатар.

Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы
У ціхую сінюю ноч
І сказаць:
"Бачыце гэтыя буйныя зоркі,
Ясныя зоркі Геркулеса?
Да іх ляціць наша сонца,
І нясецца за сонцам зямля.
Хто мы такія?
Толькі падарожныя, — папутнікі сярод нябёс.
Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі усе мы разам ляцім
Да зор?"

<u>І вядучы.</u> Пасля наведання радзімы, калі паэт на уласныя вочы пабачыу становішча беларускіх працоуных мас, сацыяльна-грамадскія матывы у яго паэзіі загучалі яшчэ больш выразна, ярчэй акрэслілася яго грамадзянская пазіцыя, пашырылася кола "праклятых пытанняу", на якія трэба было знайсці адказ, паглыбіліся ідэйныя і філасофскія пошукі паэта у намаганні дабрацца "да кораня рэчау".

<u>2 вядучы.</u> Багдановіча справядліва лічаць пачынальнікам урбаністычнай лініі у нашай паэзіі — першым, хто "з прывольных палявых дарог" пайшоу на брук маставых. Яго нізка вершау "Места", прысвечаная гораду, з"явілася новым словам не толькі ва уласнай творчасці паэта, але і у тагачаснай беларускай літаратуры.

<u>І дэкламатар.</u>

Звярнууся калісь Пегас на вулкі
З прывольных палявых дарог, —
І пракаціуся топат гулкі,
І іскры сыпнулі з-пад ног.

У грудзі кволыя запала,
Дачка каменняу, места мне.
Пачую я тэй іскры жала, —
І верш аб месце з сэрца мкне.

/"Уступ"/

<u>2 вядучы.</u> Але было б памылкаю думаць, што Багдановіч перш за усё імкнууся апаэтызаваць "горада чароуныя прынады". "Грук, гоман, гул" не мог схаваць ад яго пільных вачэй і чуйнага таго, што выяуляе самую душу заснаванага на няпраудзе і несправядлівасці грамадства.

Чалавеку сумленнаму вельмі цяжка тут, ён адчувае сябе страшэнна

стомленым, і не столькі ад спёкі, якою "пышуць дахі і асфальт", колькі ад гэтай глухаты і чэрствасці, ад якой хочацца куды-небудзь сысці, сесці на далёкай лаўцы, адпачыць.

2 дэкламатар.

Ліхтарняў свет у сіняй вышыне...
Вітрыны... мора вывесак... Як плямы,
Анонсы і плакаты на сцяне.
Кіпіць натоўп на жорсткім вулак дне!
Снуюць хлапцы, суюшчыя рэкламы...
Разносчыкі крычаць ля кожнай брамы...
Грук, гоман, гул, — усё ракой імкне.
А дальш — за радам кас, ламбардаў, банкаў —
Агні вакзала... павадка фурманкаў...
Віры людзей... сіпяшчы паравоз...
Зялёны семафор... пакгауз... склады...
Заводаў коміны пад цьмой нябёс...
О, горада чароўныя прынады!

/"У Вільні"/

3 дэкламатар.

Ад спекі пышуць дахі і асфальт,
На вуліцы ўецца пыл, і грукаціць фурманка;
"Каробушку" пяе дзіцячы альт,
І надрываецца абрыдлая шарманка.

Мо на бульвар пайсці, сесць на далёкай лаўцы,
Хаця бы крышку часу адпачыць!
Здрамнуць, газету свежую купіць
І прачытаць усё да імені выдаўцы?

/"Ад спёкі пышуць дахі і асфальт..."/

I вядучы. Агульнапрызнана, што Багдановіч — паэт надзвычай высокай культуры. Але паэтычная культура не прыходзіць сама сабой. У Багдановіча яна — вынік упартай і няспыннай працы над пашырэннем свайго кругагляду, над узбагачэннем памяці выдатнымі здабыткамі паэтычнай культуры мінулага.

2 вядучы. Багдановіч чытаў у арыгінале і перакладаў на родную мову творы Гарацыя і Авідзія, Гейнэ і Шылера, Верхарна і Верлена, выдатна ведаў і перакладаў паэзію рускую і украінскую, быў знаёмы з літаратурай многіх іншых народаў свету.

І як прыклад гэтага прапануем паслухаць асобныя творы у перакладзе Багдановіча.

I дэкламатар.

З А.Пушкіна.

Сяджу я у турме за рашоткай гады.
Узросшы на волі арол малады,
Друг сумны мой, машучы моцным крылом,
Крывавую страву клюе над акном.

Клюе і кідае, глядзіць ён ў акно
І нібы задумаў са мною адно.
Завёць мяне крыкам, паглядам сваім
І хоча прамовіць: "Давай уляцім!

Мы — вольныя птушкі! Пара, брат, пара!
Туды, дзе за хмарай бялее гара,
Туды, дзе сінеюць марскія края,
Туды, дзе гуляем... сам вецер ды я".

2 дэкламатар.

З А.Крымскага

Кажуць людзі, быццам, творачы мужчыну,
Бог зрасіў вадою высахшую гліну;
Але чорт падкраўся: выціснуўшы воду,
Падмяшаў ён слёзы ў нашую прыроду.

Нудзяць нас праз тое цягам смуткі, жалі,
І адзін ратунак, каб лны маўчалі, —
Выплакаць іх шчыра, голасна ці ціха,
Каб з слязамі разам вылілася ліха.

Ох, мне з гэтым лекам ачуняці трудна,
Слёзаў я не маю, а ў душы так нудна.
Ўжо яна згарэла, а не плачуць вочы.
Ўжо самлела сэрца, слёзы ж ліць не хоча.

3 дэкламатар.

З Г.Гейнэ

Дзяцюк шчыра любіць дзяўчыну,
Ёй іншы да сэрца прыпаў,
А іншы той іншую любіць
І мужам яе хутка стаў.
За першага, хто ні спаткаўся,
Дзяўчына са злосці ідзе.
Дзяцюк жа марнее і губіць
Жыццё маладое ў нудзе.
Старая ўжо гэта гістор"я,
Хоць новаю будзе усягды.
Як з кім яна здарыцца, — пэўне
Пакрыша ім сэрца тады.

I вядучы. Творчая дзейнасць Багдановіча шматгранная: ён быў не толькі выдатным паэтам, перакладчыкам, але і бліскучым тонкім літаратурным крытыкам, глыбокім даследчыкам і тэарэтыкам літаратуры. Паэзія, аднак, праз увесь час заставалася для яго самай блізкай стыхіяй, найпершым прызваннем, прадметам вялікай любві яго вялікага сэрца. Багдановіч — першы з паэтаў імкнуўся прывіць беларускай паэзіі невядомыя ёй дасюль тэмы і формы. Менавіта дзякуючы Максіму Багдановічу ў ёй паявіліся трыялеты, рандо, тэрцыны, пентаметры і іншыя вершатворныя формы.

2 вядучы. У артыкуле "Глыбы і слаі" ён пісаў, што "усю сваю увагу звяртае на вобразнасць зместу вершаў і разам з тым клапоцца аб згушчонасці яго, спадзяваючыся прыдаць ім праз гэта асаблівую сілу".

Кіруючыся тэзісам "каб словам было цесна, а думкам прасторна", Багдановіч — паэт дасягае ў сваіх лепшых вершах гранічнай сцісласці. З усёй яго спадчыны толькі каля дзесятка вершаў маюць па трыццаць або крыху больш радкоў. Пераважная ж большасць — паэтычныя мініяцюры, з яркім вобразам і афарыстычнай думкай, што хораша месцяцца ў васьмі, чатырох або нават у двух радках, як напрыклад:

I дэкламатар.

Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае расстанне з Вамі?
Я пабляднеў ад горкіх слёз
І трыялет пачаў славамі:
Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.

/"Трыялет"/

2 дэкламатар.

У Максіма на кашулі вышыты галубкі;
Я за тое вышывала, што цалуе губкі.

У Максіма на кашулі вышиты лісточкі;
Я за тое вышывала, што цалуе вочкі.

У Максіма на кашулі вышыты падкоўкі;
Я за тое вышывала, што цалуе броўкі.

/"У Максіма на кашулі вышыты галубкі..."/

3 дэкламатар.

Ты не згаснеш, ясная заранайчка,
Ты яшчэ асвеціш родны край.
Беларусь мая! Краіна-бранайчка!
Устань, свабодны шлях сабе шукай.

/"Ты не згаснеш ясная заранайчка..."/

І дэкламатар.

Хіліцца к вечару дзень і даўжэйшымі
робяцца цені;
З болем пад захад жыцця ўспомніш
Пра гэтае ты.

/"Пентаметры"/

І вядучы. Тьоры сапраўднай паэзіі маюць адну адметную якасць: яны вельмі лёгка, падчас з першага разу, затрымліваюцца і надоўга застаюцца ў памяці. Да іх адносяцца і творы Максіма Адамовіча Багдановіча, вялікага беларускага паэта, які ўвесь належну свайму часу і свайму народу.

Бывае, вада перапоуніць
Ставок і праз бераг памкнецца;
Калі ж з яго выбежыць лішак,
Дык далей вада не бяжыць.

Бывае і так, што руйнуе
Плаціну вада; у гэту пору
Струяцца апошнія хвалі
І сохне няшчасны ставок.
З паэтамі так жа бывае:

Адзін дае людзям ізлішкі,
Другі усё, што мае. Я гэткі:
Пяю я з надтрэснутым сэрцам,
Апошні свой скарб аддаю.

Гэтымі радкамі чарнавога накіда верша Багдановіч сам вызначае сваё стауленне да паэтычнай творчасці.

2 вядучы. Знаёмства з паэтычнай спадчынай Багдановіча пераконвае, што ён сапрауды спявау усім сэрцам, аддаючы народу свой талент і энергію да кроплі.

Паэт пакінуу нам у спадчыну такія шэдэуры нацыянальнай лірыкі, як "Зорка Венера", "Завіруха", "Слуцкія ткачыхі", якія дауно зрабіліся папулярнымі народнымі песнямі.

I дэкламатар.

Зорка Венера узышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткауся з табою,
Зорка Венера узышла.

2 дэкламатар.

З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.

3 дэкламатар.

Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.

І дэкламатар.

Буду у далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду у далёкім краю.

2 дэкламатар.

Глянь іншы раз на яе, — у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

Заўвага: Калі ёсць магчымасць, раманс "Зорка Венера" могуць выканаць спевакі, удзельнікі гуртка мастацкай самадзейнасці, добра было б і прапанаваць яго слухачам у грамзапісе.

І вядучы. За свой нядоўгі век Багдановіч зведаў нямала гора і пакут, цяжкіх душэўных мук. Горка было яму ведаць, што яго чакае. Яшчэ столькі не зроблена, яшчэ столькі не ажыццяўлёна. Ведаць — і

не змаладушнічаць, не азлобіцца. Аб блізкай смерці ён гаворыць у вершах таксама натуральна і проста, як аб жыцці, аб каханні — без роспачы і страха — з той натуральнай мудрасцю, з якой гаварыў аб гэтым вялікі Пушкін.

Ў краіне светлай, дзе я уміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

/"У краіне светлай, дзе я уміраю..."/

2 вядучы. Ён памёр таксама благародна і мужна, як жыў — без наракання і скаргаў. На яго стале застаўся неадпраўлены бацьку ліст: "Добры дзень, стары верабей... Маладому вераб"ю трэнна..." Ліста гэтага ён не адправіў, каб не прычыняць родным лішніх клапот.

Такі ён быў чалавек Максім Багдановіч, сын Адама Ягоравіча і Марыі Апанасаўны Багдановічаў, сын Беларусі.

## ПЕРАМАГАЕ, ХТО ВЕДАЕ

Літаратурная віктарына

I. Дзе, калі і у якой сям"і нарадзіуся М.Багдановіч?

/У г.Мінску, 9 снежня 1891 г. у сям"і настаунікa/.

2. Назавіце мясціны у Беларусі, звязаныя з находжаннем у іх М.Багдановіча.

/г.г.Мінск, Гродна, в.Ракуцёушчына Маладзечанскага раёна, в. Вязве Асіповіцкага раёна/

3. Калі адбыуся літаратурны дэбют пісьменніка, як называуся першы яго твор і дзе быу надрукаваны?

/ У 1907 г. у беларускай газеце "Наша ніва" надрукавана рамантычнае апавяданне М.Багдановіча "Музыка"/.

4. Якія вы ведаеце раннія паэтычныя творы М.Багдановіча?

/"Мае песні", "Прыйдзе вясна", "Ноч", "Над магілай", "На чужыне", "Лясун"/.

5. Назавіце вершы паэта аб веліч ы і хараств е прыроды.

/"Возера", "Зімовая дарога", "Па-над белым пухам вішняу", "Перад паводкай", "Падвей", "Зімой"/.

6. Пры жыцці паэта выйшау з друку толькі адзіны зборнік вершау. Што гэта за зборнік, дзе і калі ён быу надрукаваны?

/Зборнік "Вянок". Надрукаваны у Вільні у 1913 г./

7. Назавіце паэтычныя творы М.Багдановіча сацыяльна-патрыятычнай тэматыкі.

/"Краю мой родны! Як выкляты богам...", "Мяжа", "Рушымся, брацця хутчэй", "Жывеш не вечна, чалавек", "Кінь вечны плач свой аб старонцы"/.

8. Ліхтарняў свет у сіняй вышыне...
Вітрыны... мора вывесак... як плямы,
Анонсы і плакаты на сцяне.
Кіпіць натоўп на жорсткім вулак дне!
Снуюць хлапцы, суючыя рэкламы...
Разносчыкі крычаць ля кожнай брамы...
Грук, гоман, гул, — усё ракой імкне...

Гэта урывак з санета, прысвечанага гораду. Назавіце горад і скажыце, што звязвала з ім М.Багдановіча.

/г.Вільня. Тут друкаваліся творы паэта у газеце "Наша ніва". У 1911 г. М.Багдановіч наведаў Вільню/.

9. Вядома, што паэт першым прыступіў да стварэння мастацкага летапісу сярэдневяковай Беларусі. Назавіце вершы з гэтага цыкла.

/"Летапісец", "Перапісчык", "Кніга", "Безнадзейнасць"/.

10. Паэт роздуму, Максім Багдановіч хвалюе нас і сваімі вершамі аб каханні. Якія ведаеце яго творы, прысвечаныя гэтай вечнай тэме?

/"Першая любоў", "Зорка Венера", "Вераніка", "Учора шчасце толькі глянула нясмела", "Трыялет", "Сярод вуліцы у нас карагод", "У Максіма на кашулі вышыты галубкі..."/

11. Назавіце вершы паэта, пакладзеныя на музыку.

/"Завіруха", "Зорка Венера", "Ноч", "Слуцкія ткачыхі", "Лявоніха", "Зімой", "На чужыне"/.

12. Паэт напісаў у 1915 г. паэму-казку для дзяцей. Як яна называецца?

/"Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык"/.

13. У час знаходжання ў Мінску ў 1916 г. М.Багдановіч прызнаўся Зм.Бядулю, што задумаў твор на тэму біблейскага міфа. Што гэта за твор?

/Паэма "Страцім-лебедзь", якую можна ў поўнай меры разглядаць як запавет Багдановіча, як апошнюю яго слова да свету/.

14. Сям"я Багдановічаў знаходзілася ў дружбе і радні з рускім пісьменнікам. Хто гэты пісьменнік?

/А.М.Горкі. Бацька М.Багдановіча Адам Ягоравіч у другі раз жаніўся на роднай сястры К.П.Пешкавай — Аляксандры Паўлаўне Волжынай/.

Адказаць на гэтыя пытанні дапамогуць вам наступныя выданні:

Багдановіч М. Вершы. — Мн., 1981.
Багдановіч М. Маладзік. Лірыка. — Мн., 1968.
Бярозкін Р. Чалавек напрадвесні: Расказ пра Максіма Багдановіча. — Мн., 1986.
Зубараў Л.І. Максім Багдановіч. — Мн., 1989.

## ЯКІМ ЁН БЫЎ

Выказванні пра М.Багдановіча

Максім Багдановіч па праву заняў пачэснае месца ў нашай маладой паэзіі як высокаталенавіты паэт і майстра паэтычнай формы. Сярод беларускіх паэтаў Максім Багдановіч вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй, тонкім разуменнем і пачуццём паэзіі.

Я.Колас

Яго лірыка ёсць гісторыя душэўных перажыванняў, жывапісна расказаных ім самім, а усё іншае, напісанае ім, сведчыць аб яго поглядах і перакананнях і яго інтарэсах. Тут увесь чалавек.

А.Я.Багдановіч /бацька паэта/

Ёсць паэты, якія пішуць творы каб потым з іх выдаць выбранае, але ёсць і паэты, што пішуць толькі выбранае. Да такіх і належыць Максім Багдановіч.

М.Танк

Вялікі грамадзянін і патрыёт Радзімы, ён усё сваё кароткае жыццё аддаў служэнню свайму народу... Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе гэтага слова, Максім Багдановіч ад самых пачаткаў свае творчасці быў у абсягу перадавых агульначалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы.

К.Чорны

Сын Беларусі, паэт Максім Багдановіч даўно ўжо пераступіў абсягі роднай зямлі. Як свайго, яго прымаюць і за межамі Беларусі.

А.Бачыла

...Можна не сумнявацца, што міжнароднае прызнанне беларускага паэта Багдановіча ў маштабах непараўнальна большых, чым сёння, не за гарамі.

Н.Гілевіч

Багдановіч, побач з Купалам і Коласам, — тое трэцяе вымярэнне без якога немагчыма перспектыва. З Багдановічам нам стала далёка відаць ва ўсе канцы свету.

М.Стральцоў

Максім Багдановіч быў тым паэтам, які адкрыў беларускай літаратуры невядомыя ёй мастацкія старонкі...

Р.Жалязняк

Уплыў Багдановіча на беларускую паэзію і шырэй — на ўсю мастацкую культуру Беларусі велізарны, таму што гэта быў вялікі самабытны, шматгранны, глыбокі і прынцыпіяльны талент, каторы бачыў і прадбачыў.

Н.Гілевіч

Паэт усеабдымнага ахопу жыцця, Максім Багдановіч блізкі нам сваёй актуальнасцю, нябоязззю зазірнуць у любыя яго праявы — у высокае і нізкае, гераічнае і трагічнае, у самыя вострыя надзённыя і у так званыя вечныя тэмы.

А.Лойка

# У ВЯНОК МАКСІМУ

Нізка вершаў

Максім Танк

## Над магілай Багдановіча

Прагучыць сірэна у порце часам.
Кіпарысаў дрэмле ціхі сад.
Дрэмле Ялта, на крутых тэрасах
Льецца вішань белы вадапад.
Тут вясна асыпала усё цветам
І цяжэй знайсці ўчарашні след.
Хоць над раннім курганом паэта
Напісалі імя і санет.
Мне шкада, што спозніліся годы,
А твае так рана адцвілі —
Сёння разам выйшлі б мы да усходу
Прывітаць радзімы караблі.
Рокат мора, збуджанага ветрам,
Воблакаў ключ сіні і зару,
Што з вяршынь аснежаных Ай-Петры
Кожны дзень плыве на Беларусь.
Кургановў прадвечнага спакою
Кіпарысы вартай сцерагуць.
Але, пэўна, калі гром прыбою
Змоўкне і растае у пене гул, —
Чуеш ты, як звоняць сосны ціха,
Як, палі вітаючы свае,
Недзе унучка слуцкае ткачыхі
Пра вясну шчаслівую пяе.

Анатоль Астрэйка

Максіму Багдановічу

Далёка ад краіны сваёй мілай
Табе апошні даў прытулак Крым.
З граніту абеліск, не крыж пахілы,
А зорка пяцікутная над ім.

Ля помніка, нібыта вартавыя,
Пасталі кіпарысы ў каравул.
Яны без ветру быццам нежывыя,
Яны і ў вецер не ўздымаюць гул.

А ты любіў напеў бароў дрымучых,
Палёў раўніннасць, шызыя лугі,
А кіпарысы гэтыя на кручах
Стаяць як сімвал смутку і тугі.

Б..злюдна тут і ціха днём і ўночы,
Я цішыні даніну ?ддаю.
Ля помніка спыняюся, не крочу
І ў задуменні сцішана стаю.

Стаю... І чую я: з-за перакату
Шагнула песня ўдаль "Ад родных ніў...".
Яе спявалі хлопцы і дзяўчаты
На слаўны і знаёмы мне матыў.

Васіль Вітка

## Вянок

Мова дадзена — не маўчаць.
Мова дадзена — мовіць.
Не кладзіце нябыту пячаць
На паэтаву споведзь.
Не на глум, не на злом,
Не для немачы ў горле,
Ён радзіўся арлом
З крыллем орлім.
А дзе тыя арлы
У нас, на Белае Русі? —
Запытаеце вы.
Адказаць сам ён мусіў,
Як глытаў з крымскіх гор
Горкі пах палыновы,
Бачну родны прастор
І вянок свой цярновы.

Яўгенія Янішчыц

## Ялта—1917

Чысты погляд васілька.
Ціха журыцца радзіме.
Роднае поле радка
Ці не з табою, Максіме?

Чую, як мора шуміць.
Хваля
тугі не адніме.

Хочацца верыць і жыць
Ці не табе, Максіме?

Белай самоты сцяна,
Дай яму лёту і сілы!
Ці не з журбы Лесуна
У Лебедзя гордыя крылы...

Скруха душу апячэ,
А ці ўзніме нягода.
Гэта спяшаецца Чэсць
У абарону народа.

Смерць, ты цікуеш дарма.
Белых галінак кіпенне.
Смерці Паэта няма —
Ёсць Нараджэнне!

Песняй абвостраны слых,
Чуеш, Максім? — не ўмірае!
Гэта з табой. І для ўсіх
Зорка Венера світае.

Янка Сіпакоў

Ялта, Максім, кіпарысы

Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак на магільніку гарысты
Ён навучыў, здаецца, гаварыць.

Паўднёва сонца плавіцца угары,
Зямля гарачая, нібыта прысак...
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

Рыгор Барадулін

Сакольнік

Успырхнула роднае слова падлёткам
З цёплых далоняў матчынай песні.
Падлётка прыціхлага і нясмелага
Прылашчыў за пазухай хлопчык Максімка.
Вучыў яго вышыні не баяцца,
Крылы свае давяраць
Хмарам, вятрам сустрэчным...
Падлётак смялеў і лётаў
У вырай, у край сінявокі,
Што Белаю Руссю зваўся.
Вяртаўся у горад над Волгай —
І пахлі ўздужалыя крылы
Самлелым аерам Наддзвіння,
Трывожнай зарой Наднямоння,
І косамі свіцязянак...
Як здзіўлены быў блакіт,
Калі з пляча юнака Максіма
Да сонца вольны птах ускрыліў —
З ім цяжка было сагнацца
І уладарам захмар"я.
Паклон табе, горды Сакольнік
Беларускага крэўнага слова,

Беларускага вечнага слова,
Што ты заручыў яго з небам.
Дзякуй,
Максім Багдановіч!

Міхась Скобла

Максіму Багдановічу
/урывак/

...Вінаграду сонечная гронка
Падваконнік зманліва кране...
А яму усё родная старонка
Мроіцца у расчыненым акне.

А над бухтай, сіняй і санлівай,
Над адвечнай бездарожжу хваль
Лебядзінай песняю шчымлівай
Поуніцца асмужаная даль.

Страцім-лебедзь кружыцца і кліча
У край, што у росах свеціцца здаля,
Дзе сляды пагоніваяунічай
Захавала мужная зямля.

Дык чаму ж ён вылецеў, Айчына,
З-пад твайго з-пад белага крыла?
Што глядзяць самотнымі вачыма
Васількі з пісьмовага стала?

Едуць людзі -- з радасцю, з бядою,
Едуць сотні удзячных з мянкоу
Прычасціцца не святой вадою,
А святлом ягоных васількоу.

Рыгор Барадулін

Вяртанне Максіма

Якраз гулянку справіу пан Падвей,
Дадому дачакаушыся Максіма.
Не суравей, сцюдзёны суравей,
Зірні на свет ягонымі вачыма.

Праз дзевяноста год,
Бы у забыцці,
Ідзе паэт па зменёнаму Менску.
Між камяніцау хочацца знайсці
Драуляны дом,
Як той дубок на узлеску.

Яму паабяцау Сяргей Вакар,
Які змушае камень засмяяцца,
Што дом свой
Знойдзе блізка гаспадар,
Ды некуды надоуга знік дарадца.

Не рада Свіслач ледзяным плітам.
Нахмурыуся брывамі голля шэрас.
Падацца б на Захар"еускую --
Там
Чакае маладая Зоська Верас...

Так і стаяў,
Пакуль яго ўначы
Не ўбранзавела вопратка ад стыні.
Снег не растаў і ўранні на плячы,
Як і належыць снегу на вяршыні.

Данута Бічэль-Загнетава

Ракуцёўшчына 31 мая 1987

Хто нашу зямельку адновіць?
Верне яе блакіту бязмеры?
Глядзіць у вочы Максім Багдановіч
вачыма зоркі Венеры.

Хто нашу мову замовіць
ад вуснаў злых, нечытэльнай паперы?
Глядзіць у вочы Максім Багдановіч
з надзеяй зоркі Венеры.

Хто нашы душы заслоніць?
У душы дзяцей хто ўкладзе крыху
веры?
Гарыць высока Максім Багдановіч
ясным агнём зоркі Венеры.

А пушчы гамоняць зноў.
А зорак зімова маўчанне.
Між зор накрэсліў Максім Багдановіч:
— Б'це ў сэрцы нам, біце мячамі!

Лятуць і лятуць тыя коні
з атручанага Палесся.
І дзе ім пасвіцца сёння —
у полі, у небе ці лесе?

Няхай напруга адхлыне...
Наш лёс нашых коней запрог.
Яшчэ не затоплена наша Прыдзвінне.
І там сакаўны мурог.

Мікола Кавалеўскі

Максіму Багдановічу

Даруй, Паэт!
Прабач, шаноўны,
што у вірлівай мітусні
ірвалі з жарам бессаромным
свайй Айчыны карані.

Такіх Сыноў не лішне мела
многапакутная зямля —
то зарастала, то мялела
табой узараная ралля.

Раманс пра Зорку часам пелі,
любілі родны Васілёк,
аднак бяспамяцтва завеі
знішчалі у сэрцах твой Вянок.

Гублялі мову беларусы,
не адчуваючы бяды —
такіх духоўных землятрусаў
не ўяўляў, напэўна, ты.

Даруй, Змагар!
Прабач, Максіме!
Не кінь нашчадкам крыўдных слоў —
павер, што ім яшчэ па сіле
свядомасць адрадзіць ізноў.

Няхай цябе не раніць скруха,
ад болю вочы не блішчаць:
Вясна ідзе, Паэт, паслухай —
яе не сцішыць, не стрымаць.

## ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУЦЯВІНЫ

### Асноўныя даты

1891. — 9 снежня /27 лістапада ст.ст./ у Менску у сям"і настаўніка Адама Ягоравіча і яго жонкі Марыі Апанасаўны нарадзіўся другі сын — Максім.

x x x

1892. — Чэрвень. Сям"я Багдановічаў пераехала у Гародню /Гродна/.

x x x

1896. — 4 кастрычніка. Памерла маці Максіма.

x x x

1896. — Сям"я Багдановічаў пераязджае у Ніжні Ноўгарад.

x x x

1902. — Максім паступае у гімназію.

x x x

1907. — Адсылае у газету "Наша ніва" свой першы твор — рамантычнае апавяданне "Музыка".

1908. — Сям"я Багдановічаў пераязджае у Яраслаўль.

x x x

1909. — У газеце "Наша ніва" надрукаваны першыя вершы. Працягвае пісаць паэтычныя творы, піша свой першы артыкул "І.Неслухоўскі".

x x x

1911. — М.Багдановіч закончыў гімназію. Здзейсніў паездку у Беларусь, наведаў рэдакцыю "Нашай нівы" у Вільні, каля двух месяцаў правёў у фальварку "Ракуцёўшчына" /каля Маладзечна/.

У гэтым жа годзе паступае ў Яраслаўскі юрыдычны ліцэй.

Пачынае паэму "Вераніка", заканчвае цыкл вершаў "Старая спадчына", піша некалькі артыкулаў.

x x x

1912. — У газеце "Наша ніва", №26, друкуецца цыкл вершаў аб мінулым Беларусі /сярод іх "Слуцкія ткачыхі"/. У гэтым жа годзе перакладае 22 вершы французскага паэта Поля Верлена.

1913. — Выйшла ў Вільні адзіная прыжыццёвая кніжка вершаў "Вянок".

x x x

1914. — Працягвае пісаць вершы і артыкулы, выйшлі асобныя брашуры з серыі "Біблиятэка вайны", "Братья-чехи", "Угорская Русь", "Червонная Русь".

x x x

1915. — Піша цыкл "Вершы беларускага складу", паэмы, артыкулы, пераклады. Едзе на лячэнне ў Стары Крым.

x x x

1916. — Заканчвае ліцэй, пераязджае ў Менск. дзе працуе ў губернскім харчовым камітэце, прымае актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны. Піша вершы і артыкулы.

x x x

1917. — У канцы лютага едзе на лячэнне ў Крым. Жыве ў Ялце. У апошнія дні свайго жыцця працуе над стварэннем беларускага буквара. Памёр 25 /12 ст.ст./ мая. Пахаваны ў Ялце.

## СТРУНЫ ПАМЯЦІ

Творы М.Багдановіча, пакладзеныя на музыку

Вераніка. — Муз. І.Лучанка.

Завіруха. — Муз. Э.Тырманд.

Зімовая дарога. — Муз. Э.Тырманд.

Зімой. — Муз. Э.Тырманд.

З песняў беларускага мужыка. — Муз.А.Багатырова.

Раманс /"Зорка Венера ўзышла над зямлёю"/ — Народная мелодыя. Апрацоўка мелодыі А.Багатырова.

Зорка Венера /опера/. — Лібрэта А.Бачылы, камп. Ю.Семяняка.

Лявоніха. — Муз. А.Туранкова.

Маладыя гады. — Муз. А.Багатырова.

Набягае яно. — Муз. А.Багатырова.

Над магілай. — Муз. А.Багатырова.

На чужыне. — Муз. А.Багатырова.

Ноч. — Муз. А.Багатырова.

Ой, лясы-бары ды лугі-разлогі! — Муз. А.Туранкова.

Падвей. — Муз. А.Туранкова.

Скірпуся. — Муз.А.Туранкова.

Слуцкія ткачыхі. — Муз. А.Туранкова.

Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха залягае. — Муз.А.Туранкова.

Як прыйшла я на ток малаціць... Муз.М.Аладава.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

Багдановіч М. Збор твораў. У 2-х т. — Мн.: 1968.

Багдановіч М. Выбранае. — Мн.: 1977.

Багдановіч М. Выбраныя творы. Вершы, апавяданні, артыкулы. — Мн., 1952.

Багдановіч М. Творы, вершы, апавяданні, нарысы. — Мн.: 1957.

Багдановіч М. Вершы. — Мн.: 1981.

Багдановіч М. Вершы. Выд. 2-е. — Мн.: 1973.

Багдановіч М. Вершы. — Мн.: 1967.

Багдановіч М. Маладзік: Лірыка. — Мн.: 1968.

Богданович М. Избранные произведения. — М.: 1953.

Богданович М. Венок: Лирика. — Мн.: 1985.

Богданович М. Узор василька: Избр. лирика. — Мн.: 1985.

x x x

Багдановіч М. // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5-ці т. Т.I. — Мн.: 1984. С.255—257.

Аляксандровіч С. Пушчвіна паэта // Аляксандровіч С. Незабыўнымі сцежкамі. Выд. 2-е, дап. — Мн.: 1962. С.97—114.

Барсток М. Максім Багдановіч: Нарыс аб жыцці і творчасці. — Мн.: 1961.

Бачыла А. Дарогамі Максіма Багдановіча. 2-е выд., перапрац. і дап. — Мн.: 1983.

Бярозкін Р. Чалавек напрадвесні; Расказ пра Максіма Багдановіча. Мн.: 1986.

Вата́цы Н. Шляхі паэта. — Мн.: 1975.

Ватацы Н. Шляхі. — Мн.: 1986.

Гілевіч Н. Ты не згаснеш, ясная зараначка... // Н.Гілевіч.

Удзячнасці і абавязак. Літ.-крыт. артыкулы і нататкі. — Мн.: 1982. С.19—32.

Зубарау Л.І. Максім Багдановіч. — Мн.: 1989.

Зуборев Л.И. Крик буревестника: Ист.-докум. повесть о М.Горьком и Богдановичах. — Мн.: 1989.

Кабаковіч А. Паэзія Максіма Багдановіча /Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага/. — Мн.: 1978.

Клімковіч М. Максім Багдановіч // Клімковіч М. Літаратурна-крытычныя артыкулы. — Мн.: 1963. С.16—23.

Лойка А.А. Максім Багдановіч. — Мн.: 1966.

Майхровіч С. Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць. — Мн.: 1958.

Перкін Н. Максім Багдановіч // Перкін Н. Абсягі і думкі. — Мн.: 1980. С.152—168.

Стральцоў М. Загадкі Багдановіча. — Мн.: 1968.

Шлях паэта. Зборнік успамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра Максіма Багдановіча. — Мн.: 1975.

# К А Л Я Н Д А Р
## асноўных святочных урачыстасцяў да 100-годдзя Максіма Багдановіча

| | |
|---|---|
| 17-19 мая | Ушанаванне Памяці Паэта ў горадзе Ялта : мітынг на Лівадзійскіх могілках; урачысты вечар у драматычным тэатры імя А.П.Чэхава ;урачыстасць каля мемарыяльнага знака на вуліцы Максіма Багдановіча; адкрыццё экспазіцый пра М.Багдановіча; выстаўка-продаж беларускіх кніг. Творчыя сустрэчы з прадстаўнікамі беларускай літаратуры і культуры ў санаторыях "Беларусь","Расія","Украіна",у працоўных калектывах горада ; дэманстрацыя кінафільмаў пра М.Багдановіча ў кінатэатрах горада; па тэлебачанні. |
| 26 мая | Багдановіцкія чытанні ў Садзе Максіма Багдановіча ў Мінску каля ДАВТа. |
| 30-31 жніўня | Святочныя ўрачыстасці ў вёсцы Вязье Асіповіцкага раёна Магілеўскай вобласці. |
| 1 верасня | Усебеларускае свята паэзіі ў вёсцы Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. |
| 2 верасня | Багдановічавы ўрокі ў школах, ПТВ, дзіцячых садах і інш. |
| 20-22 верасня | Ушанаванне Памяці Паэта ў Ніжнім Ноўгарадзе : урачыстасці на вуліцы Максіма Багдановіча, якой прысвойваецца імя паэта ў сувязі з яго юбілеем; літаратурна-музычны вечар у драматычным тэатры імя М.Горкага, канцэрты ў оперным тэатры, Крамлёўскай канцэртнай зале, Палацы культуры аўтазавода ; выстаўка-продаж беларускіх кніг ; дэманстрацыя кінафільмаў пра жыццё і творчасць паэта ў кінатэатрах горада, па тэлебачанні ;творчыя сустрэчы пісьменнікаў і артыстаў, супрацоўнікаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, мастакоў, |

| | |
|---|---|
| | іншых членаў беларускай дэлегацыі з працоўнымі калектывамі горада і вобласці. |
| 26-28 верасня | Ушанаванне Памяці Паэта у Яраслаўлі : адкрыццё Дома-музея М.Багдановіча ; урачысты вечар у Акадэмічным тэатры імя Ф. Волкава ; выстаўка-продаж беларускіх кніг ; літаратурна-музычныя вечары ў Палацы культуры і тэхнікі імя А.Дабрыніна, Палацы культуры маторнага завода, творчыя сустрэчы ў працоўных калектывах ; дэманстрацыя кінафільмаў у кінатэатрах горада і па тэлебачанні - пра М.Багдановіча і яго літаратурнае асяроддзе ; наведванне магілы бацькі паэта Адама Ягоравіча Багдановіча. |
| 25-27 кастрычніка | Ушанаванне Памяці Паэта ў Гродне : наведванне магілы маці - Марыі Апанасаўны ; адкрыццё новай экспазіцыі Дома-музея М.Багдановіча ; фестываль маладой паэзіі і аўтарскай песні ; вечар у абласным драматычным тэатры. |
| Кастрычнік-лістапад | Літаратурна-музычныя вечары ў Кіеве, Львове, Вільні ; экспанаванне ў гэтых гарадах юбілейных выставак ; Багдановіцкія чытанні. |
| 24 лістапада | Канцэрт з прэм'ерным прадстаўленнем новых музычных твораў на вершы Максіма Багдановіча ў Белдзяржфілармоніі. |
| 2 снежня | Адкрыццё кніжнай выстаўкі "Светлы след будзе вечна жывы..." у Дзяржбібліятэцы імя У.І.Леніна. |
| 1-10 снежня | Багдановіцкія чытанні ва ўсіх навучальных і культурных установах ; Святы паэзіі на вуліцах і ва ўстановах, названых імем М.Багдановіча СШ №40 г. Мінска, мінскай бібліятэцы імя М.Багдановіча і інш.- паўсямесна па рэспубліцы . |

| | |
|---|---|
| 6 снежня | Канцэрт з прэм'ерным прадстаўленнем новых музычных твораў на вершы Максіма Багдановіча ў Доме літаратара Саюза пісьменнікаў БССР. |
| 7 снежня | Адкрыццё літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску. |
| 8 снежня | Дзень Максіма Багдановіча на ВДНГ БССР. |
| 9 снежня | Юбілейная асамблея вучоных-багдановічазнаўцаў у АН БССР. |
| 9 снежня | Юбілейныя урачыстасці у ДАВТе БССР у Мінску. |
| 20 снежня | Юбілейныя урачыстасці у Калоннай зале Дома Саюзау у Маскве. |
| 6 снежня-<br>I5 студзеня | Выстаўка выяўленчага мастацтва "Краса, і светласць, і прастор...", прысвечаная I00-годдзю Максіма Багдановіча. |

# З М Е С Т

АД СКЛАДАЛЬНІКА.......................................................... 4

ЯК ЗОРКА ЯРКАЯ НАД РОДНЫМ КРАЕМ.
Па старонках біяграфіі М.Багдановіча............................... 5

ЦВЯТОК РАДЗІМЫ ВАСІЛЬКА. Сцэнічная кампазіцыя............... 15

ПЕРАМАГАЕ, ХТО ВЕДАЕ. Літаратурная віктарына...................... 39

ЯКІМ ЁН БЫЎ. Выказванні пра М.Багдановіча........................ 42

У ВЯНОК МАКСІМУ. Нізка вершаў.............................................. 46

ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУЦЯВІНЫ. Асноўныя даты......................................... 56

СТРУНЫ ПАМЯЦІ. Творы М.Багдановіча, паклацзеныя на музыку... 58

СПІС ЛІТАРАТУРЫ........................................ ................ 59

МАКСИМ БОГДАНОВИЧ

Материалы к празднованию 100-летнего юбилея поэта

На белорусском языке

Составитель Розум Николай Григорьевич

редактор Беганский Е.М.

Падпісана да друку 13.05.91 Фармат 60х84 I/16.

Папера друкарская № 2. Афсетны друк. Умоун.-друк.арк.

Ул.-выд.арк. Тыраж 12000(I з-д) Заказ 459

Цана 0-50коп

Беларускае таварыства "Кніга", 220034, Мінск, вул.Чырвонаармейская,24.

Надрукавана на ратапрынце Мінскага вытворчага прадпрыемства "Спадчына" Беларускага таварыства "Кніга".
Мінск, вул.Рэвалюцыйная, 12.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі

B0000001326353